**Дзмітры Крывашэй**
(Мінск)

# Нацыянальна-культурная дзейнасць літоўскага насельніцтва Гродзенскага павета ў 1930-х гадах (на падставе матэрыялаў Дзяржаўнага ваяводскага архіва ў Беластоку)

Тэма гісторыі літоўскай супольнасці Гродзеншчыны ў міжваенны перыяд дастаткова добра распрацавана як у замежнай, так і беларускай гістарыяграфіі. Першыя працы былі напісаны непасрэдна ў 1920-1930-я гады[1]. У далейшым да гэтый тэмы польскія і літоўскія гісторыкі звярталіся неаднаразова[2]. Сярод сучасных беларускіх даследчыкаў неабходна назваць прозвішча Аляксандра Вабішчэвіча. У сваім грунтоўным даследаванні „Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.)"[3] сярод іншага аўтар абапіраецца на матэрыялы з фондаў Дзяржаўнага ваяводскага архіва ў Беластоку. Аднак ён толькі закранае некаторыя моманты гісторыі літоўцаў Гродзенскага павета, прыводзіць толькі некалькі фактаў. Зразумела, што ў задачу даследчыка не выносілася рэканструкцыя дзейнасці нацыянальна-культурных аб'яднанняў літоўскай супольнасці ў Гродзенскім павеце. Яе рашэнню прысвячаецца наш артыкул.

Асноўнай крыніцай інфармацыі для нас сталі дакументы Беластоцкай ваяводскай управы за 1920-1939 гг. Сярод іх — штомесячныя справаздачы аб становішчы грамадска-палітычных і нацыянальных спраў, якія вызначаюцца шырокім ахопам падзей і дакладнасцю ў прывядзенні фактаў. Дакументы ўтрымліваюць зводныя табліцы, у якіх пазначаны назвы арганізацый нацыянальных меншасцей, па кожнай з іх прыводзяцца лічбы колькасці сходаў, розных прадстаўленняў (напр., тэатральных пастановак), забаваў (напр., танцавальных вечарын), лекцый, агульная колькасць удзельнікаў, суадносіны паміж найменшай і найбольшай

[1] S. Gorzuchowski, *Ludność litewska na kresach państwa polskiego*, Warszawa 1929; Е. С. Матулайтис, *Литовцы под гнётом фашистской Польши (Политико-экономический очерк)*, Минск 1936.

[2] B. Makowski, *Litwini w Polsce, 1920-1939*, Warszawa 1986; З. Зинкявичюс, *Восточная Литва в прошлом и настоящем*, Vilnius 1996; R. Dąbrowski, *Działalność społeczno-gospodarcza i kulturalna mniejszości narodowych w II Rzeczypospolitej (1918-1939)*, Szczecin 1990; M. Iwanicki, *Ukraińcy, Białorusini, Litwini i Niemcy w Polsce w latach 1918-1990*, Siedlce 1991; P. Łossowski, *Stosunki polsko-litewskie, 1921-1939*, Warszawa — Łowicz 1997.

[3] А. М. Вабішчэвіч, *Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921-1939 гг)*, Брэст 2008.

колькасцю ўдзельнікаў у адным мерапрыемстве, атрыманы прыбытак.

Грунтуючыся толькі на дадзеных з табліц можна прасачыць дынаміку актыўнасці розных арганізацый, атрымаць звесткі аб колькасці ўдзельнікаў і ўплывовасці арганізацыі на грамадскую думку. Больш блізкае знаёмства са зместам справаздач дазваляе акунуцца ў атмасферу эпохі, адчуць напружанне барацьбы нацыянальных супольнасцяў за свае правы і адначасова ўбачыць шмат непаразуменняў і абвінавачванняў паміж арганізацыямі. Акрамя гэтага вярнуць з забыцця імёны актыўных дзеячаў нацыянальна-культурнага адраджэння.

Па даных перапісу 1931 г. на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства налічвалася 6298 асобаў літоўскай нацыянальнасці. Амаль усе яны пражывалі на тэрыторыі Гродзенскага павета — 6246 чалавек. Цікава, што перапіс 1921 г. выявіў на тэрыторыі гэтага ж павета толькі 976 літоўцаў — у 6,4 разы меней. Пры тым, што за дзесяцігоддзе колькасць насельніцтва павета ў цэлым вырасла на 42% — са 150 тыс. да 213 тыс. чалавек[4].

Сярод грамадскіх арганізацый, якія аб'ядноўвалі прадстаўнікоў літоўскай нацыянальнасці, у першай палове 1930-х гадоў найбольш уплывовымі былі Літоўскае грамадска-асветнае таварыства „Рытас" і Таварыства св. Казіміра.

Літоўскае асветнае таварыства „Рытас" („Ранак") узнікла яшчэ ў 1913 г. у Вільні. Пасля заняпаду дзейнасці ў пачатку 1920-х гадоў актывізацыя пачалася ў 1923 г. і працягвалася да восені 1927 г., калі польскія ўлады распачалі ганенні літоўскіх грамадскіх актывістаў. У такіх умовах дзейнасць таварыства сканцэнтравалася на мерах, накіраваных на замазахаванне. З 1932 г. асноўным напрамкам дзейнасці стала стварэнне ў мясцовасцях, дзе раней існавалі літоўскія школы, бібліятэк-чытальняў[5]. У перыяд з 1933 г. і да спынення дзейнасці Таварыства ў 1938 г. яго кіраўніком і віцэ-старшынёй Часовага літоўскага камітэта ў Вільні быў святар Крыступас Чыбірас (1888-1942)[6].

Літоўскае таварыства выхавання і апекі моладзі імя св. Казіміра займалася як культурна-асветнай, так і рэлігійнай працай. Яно было заснавана літоўскімі хрысціянскімі дэмакратамі ў Вільні яшчэ на пачатку 1920-х гадоў, але афіцыйна зарэгістравана толькі ў 1925 г.[7]

[4] *Bevölkerungsstatistik Weissrutheniens: Verzeichnis der kleineren und kleinsten Verwaltungseinheiten der weissruthenischen SSR einschl. der 1939 eingegliederten Ostgebiete Polens sowie der Gouvernements Bryanssk und Smolensk: Mit statistischen Angaben uber ihre Bevolkerung auf Grund der sowjetamtlichen Volkszahlung vom 17.12.1926 und der amtlichen polnischen Volkszahlungen vom 30.9.1921 und 9.12.1931*, Ausgearb.u.hrsg.von der Publikationsstelle Berlin-Dahlem, Berlin 1942, s. 27.

[5] А. М. Вабішчэвіч, *Нацыянальна-культурнае жыццё...*, с. 234-238.

[6] *Čibiras Kristupas*, [у:] *Lietuvių dvasininkų kūrėja*, Vilnius 2000, s. 610.

[7] А. М. Вабішчэвіч, *Нацыянальна-культурнае жыццё...*, с. 239.

У ходзе ажыццяўлення культурна-асветнай работы адбывалася актыўнае супрацоўніцтва аддзелаў Таварыства св. Казіміра са структурамі „Рытаса”[8].

Легальная дзейнасць дадзеных грамадскіх аб’яднанняў на тэрыторыі памежных з Літвою паветаў Гродзеншчыны працягвалася да часовага прыпынення польскімі ўладамі ў красавіку 1936 г. Апошняя распаўсюджвалася таксама на Літоўскае сельскагаспадарчае таварыства. У далейшым — 21 лістапада 1936 г. — беластоцкі ваявода афіцыйна забараніў дзейнасць структурных адзінак Таварыства св. Казіміра на тэрыторыі Сувалкаўскага і Гродзенскага паветаў. 3 снежня 1936 г. пад забаронай апынуліся ўсе яго аддзелы ў памежнай зоне[9].

Вядома, што па стане на май 1936 г. усе тры згаданыя аб’яднанні існавалі ў наступных населеных пунктах Гродзенскага павета: Марцынкянцы (сучасн. Марцынконіс), Мустэйкі (Мустэйка), Моргіевічы (Моргёніс), Рандомянцы (Рандомоніс), Шкляры (Шклерай). У Капенішках (Капенішкяй), Ротніцы (Ротніца), Дубеніках (Дубенінкас) і Рудні існавалі як чытальні „Рытаса”, так і аддзелы Таварыства св. Казіміра. Толькі чатальні „Рытаса” існавалі ў Даржэлях (Даржеляй), Кабелях (Кабеляі, гміна Марцынкянцы), Кабелях (гміна Бершты), Шумах (Шумас). Толькі аддзелы Таварыства св. Казіміра — у Мардасаве (Мардасавас), Кашэтах (Кашетос), Пухачах[10]. Амаль усе адзначаныя населеныя пункты цяпер знаходзяцца ў Варэнскім раёне Алітускага ўезда Рэспублікі Літва. Вёскі Рандомоніс, Ротніца — у Друскенінкайскім раёне таго ж уезда, Мясцазнаходжанне вёскі Пухачы намі не высветлена. Яна хутчэй за ўсё знаходзілася недалёка ад Марцынконіса. Вёска Кабелі, якая знаходзілася ў гміне Бершты, цяпер не існуе.

Да вясны 1936 г. таварыствы „Рытас” і св. Казіміра праводзілі значную нацыянальна-культурную дзейнасць. У 1933-34 гг. яны арганізоўвалі сетку літоўскіх бібліятэк і чытальняў[11]. У вёсцы Кашэты (гміна Марцынкянцы) былая літоўская настаўніца Стэфанія Бобіліч у маі 1933 г. праводзіла працу па арганізацыі публічнай літоўскай бібліятэкі, для якой былі ўжо атрыманы 60 кніг з Таварыства „Рытас” у Вільні[12]. У кастрычніку 1933 г. бібліятэкі і чытальні толькі ў межах гміны Марцынкянцы адкрыліся ў Даржэлях, Ротніцы і непасрэдна ў Марцынкянцах. Кіраўнікамі іх сталі пераважна былыя літоўскія настаўнікі[13].

[8] Там жа, с. 242.
[9] Там жа, с. 247.
[10] Wojewódzkie Archiwum Państwowe w Białymstoku (далей: WAPwB), akta Urzędu Wojewódzkiego Białostockiego (далей: UWB), sygn. 91, k. 58v-59.
[11] WAPwB, akta UWB, sygn. 77, k. 3.
[12] WAPwB, akta UWB, sygn. 73, k. 127v.
[13] Tamże, k. 218.

У лютым 1934 г. „Рытас” праводзіла акцыю, накіраваную на супрацьдзеянне польскай школьнай адукацыі і стварэнне сеткі нелегальных літоўскіх школ (легальныя школы былі зачынены яшчэ ў канцы 1920-х гадоў)[14]. Вынікам агітацыі з’явілася значнае змяншэнне ў канцы 1934 г. навучэнцаў — літоўцаў, якія замест у польскія школы сталі хадзіць у літоўскія, арганізаваныя Таварыствам „Рытас”. У вёсцы Моргілевічы гміны Марцынкянцы Гродзенскага павета бацькі такіх дзяцей адмовіліся плаціць штрафы за тое, што апошнія не наведваюць школу[15]. У лістападзе таго ж года літоўскія дзеячы Таварыства „Рытас” і Таварыства св. Казіміра на тэрыторыі Гродзенскага павета праводзілі агітацыю супраць наведвання літоўскай моладдзю курсаў удасканалення, якія праводзіліся настаўнікамі сярэдніх школ. Такая агітацыя мела поспех. Напрыклад, у вёсцы Ротніца Гродзенскага павета ні адзін літовец такія курсы не наведваў[16]. Жыхары — літоўцы гэтай жа вёскі пад уплывам кіраўніка мясцовай літоўскай чытальні Станіслава Казлоўскага ў кастрычніку 1934 г. падалі скаргу школьнаму інспектару на настаўніка Панкоўскага, абвінаваціўшы апошняга ў „ненавучанні літоўскай мове і неадпаведнасці ўвогуле становішчу настаўніка”[17]. У вёсцы Міцюны (сучасн. — в. Міцюнай Друскенінкайскага р-на) восенню 1935 г. ні адно літоўскае дзіцё не хадзіла ў школу. Іх бацькі падалі заявы аб тым, што дзеці ахоплены прыватным навучаннем. Іх навучаннем займалася кіраўнічка мясцовага аддзела Таварыства „Рытас”. З кожным з 32 дзяцей яна займалася асобна[18].

Агітацыя працягвалася і пасля забароны таварыстваў. У канцы 1936 г. школьнікаў заклікалі не наведваць заняткі па рэлігіі, якія праводзіліся на польскай мове. У выніку ў пачатковай школе ў Марцынкянцах на гэтых занятках прысутнічала ледзьве 1% літоўскіх дзяцей[19].

Непасрэдна актыўныя дзеячы забароненых таварыстваў і на нелегальным становішчы працягвалі антыпольскую агітацыю. Напрыклад, у 1936 г. у вёску Кракшле гміны Араны (цяпер в. Крокшліс Варэнскага р-на) у 1936 г. перасялілася Юзэфа Самакар, якая да гэтага кіравала чытальняй ў в. Шумы (гміны Бершты, цяпер в. Шумас). Заўважым, што пераезд быў недалёкім. Вёскі знаходзяцца насупраць праз рэчку Ула. На новым месцы яна выступала ў кантактах з мясцовым насельніцтвам як інструктарка Таварыства св. Казіміра. Для насельніцтва вёскі Шумы пасля выезду Ю. Самакар кіраўнік пачатковай школы арганізаваў курсы для

14 WAPwB, akta UWB, sygn. 77, k. 20v.
15 Tamże, k. 205v.
16 Tamże, k. 216v.
17 Tamże, k. 165.
18 WAPwB, akta UWB, sygn.82, k. 94v.
19 WAPwB, akta UWB, sygn. 91, k. 142v.

дарослых і курсы кройкі і шытва для дзяўчат. 18 кастрычніка Ю. Самакар прыехала ў гэту вёску і пачала праводзіць працу з насельніцтвам з мэтай байкатавання курсаў. Для гэтага нават абяцала выставіць іх у прэсе як здраднікаў. Адначасова адзначала, што „толькі выключна яна прыслана на гэтую тэрыторыю сваімі людзмі з мэтай правядзення пазашкольнай асветы і дапамогі ва ўсім літоўскаму насельніцтву". У выніку праведзенай агітацыі дзеці пачалі наведваць кватэру Самакар, а ў школе ў Шумах сталі праводзіцца акцыі байкоту выкладання. Апошнія праявіліся ў форме непрынясення ў школу падручнікаў польскай мовы і гісторыі, адмовах адказваць на пытанні з польскай гісторыі, а таксама ў спевах на перапынках на літоўскай мове песні, якая пачыналася са словаў „О то здраднік Жалігоўскі і той вырадак Пілсудскі". У той жа школе 21 кастрычніка на дошцы быў зроблены надпіс па-літоўску: „Таму беламу арлу палякаў адарвем мы галаву і крылы"[20].

Байкаталіся таксама падобныя курсы пазашкольнай асветы, кройкі і шытва ў в. Капенішкі (гміна Марцынкянцы). Гэта быў вынік агітацыі Альфонса Язукевіча, былога кіраўніка распушчанага аддзела Таварыства св. Казіміра[21].

Увосень 1937 г. былыя кіраўнікі чытальняў Таварыства „Рытас" пачалі арганізоўваць гурткі „Рыцарства Ісуса". У іх па стане на лістапад таго ж года былі ўцягнуты 200 дзяцей школьнага ўзросту. Кіраўнікі гурткоў мелі задачу аховы дзяцей ад уплываў польскай школы. Планавалася для дзяцей арганізаваць калядную ёлку з такім разлікам, каб яна адбылася перад падобным мерапрыемствам у школе[22].

Антыпольская агітацыя трапляла на ўрадлівую глебу. Літоўцы пры кожным спрыяльным выпадку імкнуліся дэманстраваць сваё адмоўнае стаўленне да польскасці і падкрэсленне сваёй нацыянальнасці. Напрыклад, на грамадскіх сходах, калі солтыс чытаў розныя распараджэнні ўладаў, удзельнікі дэманстратыўна разыходзіліся, даводзячы такім чынам, што яны не разумеюць па-польску[23].

Сярод літоўцаў з актыўным удзелам кіраўнікоў рытасаўскіх чытальняў праводзілася агітацыя за поўнае ігнараванне ўсіх польскіх арганізацый, нават сацыяльна неабходных (напрыклад, пажарнай службы). Літоўская моладзь імкнулася размаўляць па-літоўску нават у стараствах з прадстаўнікамі мясцовай адміністрацыі[24]. Для дэманстравання нацыянальных пачуццяў літоўцы выкарыстоўвалі нават царкоўныя будынкі. Напрыклад, у чэрвені 1933 г. жыхары вёскі Рандомянцы (гміна Мар-

[20] Tamże, k. 113v.
[21] Tamże, k. 128v.
[22] WAPwB, akta UWB, sygn. 98, k. 142v.
[23] WAPwB, akta UWB, sygn. 82, k. 8v.
[24] WAPwB, akta UWB, sygn. 91, k. 21v.

цынкянцы) за ўласныя грошы закупілі харугву ў нацыянальных літоўскіх колерах і размясцілі яе ў касцёле ў в. Ротніца[25].

У жніўні 1933 г. для сваіх сяброў Таварыства св. Казіміра стала выдаваць спецыяльную форму. У гміне Марцынкянцы форму атрымалі нават жаночыя аддзелы. Ужо ў наступным месяцы (17 верасня) старшыня аддзела Таварыства ў Марцынкянцах арганізаваў паход прыкладна 30 сяброў Таварыства. Усе ўдзельнікі былі апрануты ў спецыяльную форму і ўпрыгожаны „недазволенымі літоўскімі адзнакамі". Акцыя была арганізавана нягледзячы на вынесенае папярэджанне аб тым, што „такога адзення насіць нельга" і была яшчэ на самым пачатку разагнана паліцыяй, прытым чатыром удзельнікам былі вынесены адміністрацыйныя спагнанні[26].

У снежні 1933 г. літоўскае насельніцтва Марцынкянцаў паставіла на плошчы перад мясцовым касцёлам крыж, размаляваны ў нацыянальныя літоўскія колеры. Па загадзе гродзенскага павятовага старасты 7 снежня гэты крыж паліцыя перанесла на мясцовыя могілкі. У ноч на 8 снежня жыхары мястэчка зноў укапалі яго перад касцёлам. У выніку ўлады гэты крыж ад касцёла прынялі, а вінаватыя былі прыцягнуты да адказнасці[27].

Нягледзячы на адміністрацыйныя спагнанні, у наступным годзе кіраўніцтва Таварыства св. Казіміра, побач з задачамі пашырэння сеткі бібліятэк-чытальняў, зноў выступіла ініцыятарам пабудовы вітаўтавых крыжоў-помнікаў, а таксама забеспячэння сяброў Таварыства форменнымі шапкамі і сімволікай літоўскай дзяржаўнасці[28].

Ужо пасля забароны, 1 верасня 1936 г., кіраўнік Таварыства св. Казіміра на тэрыторыі Гродзенскага павета Тэафіл Сухоцкі разам з сябрамі Таварыства ў Марцынкянцах сабраў каля 40 асобаў моладзі ў ваколіцах могілак на месцы, дзе ў 1934 г. улады знеслі крыж, размаляваны літоўскімі нацыянальнымі колерамі. Пасля таго, як быў праспяваны літоўскі гімн на гэтым месцы, ён быў паўтораны на могілках над магіллем літоўскага салдата, куды ўсе скіраваліся па прапанове Адольфа Корсака. Пасля гэтага той жа Корсак заклікаў да барацьбы „за Літву і вызваленне". Затым пад кіраўніцтвам Сухоцкага былі праспяваны некалькі літоўскіх песень, сярод якіх і тая, якая пачыналася са словаў „Мы без Вільна жыць не можам. Вільна адбярэм і да Літвы далучым"[29].

Вітаўтавы крыжы працягвалі ставіцца і ў далейшым. Пры гэтым абавязкова ва ўрачыстых умовах. 9 снежня 1936 г. у вёсцы Шумы (гміна

[25] WAPwB, akta UWB, sygn. 73, k. 147v.
[26] Tamże, k. 198-198v.
[27] Tamże, k. 251.
[28] WAPwB, akta UWB, sygn. 77, k. 78.
[29] WAPwB, akta UWB, sygn. 91, k. 128v.

Бершты Гродзенскага павета) адбылася ўрачыстасць асвячэння крыжа. Службу правёў пробашч рымска-каталіцкай парафіі з Дубіч (сучасн. — в. Дубічай Варэнскага р-на). Ва ўрачыстасці прыняла ўдзел моладзь як з самой вёскі, так і з суседняй Кракшле. У канцы быў праспяваны літоўскі гімн[30].

Неабходна адзначыць, што пасля забароны дзейнасці нацыянальных таварыстваў, адным з цэнтраў гуртавання літоўскіх нацыянальных пачуццяў стаў касцёл, а актыўнымі прапагандыстамі літоўскай нацыянальнай ідэі — каталіцкія святары. Улады ўлетку 1937 г. адзначалі выпадкі літвінізацыі прозвішчаў мясцовага насельніцтва памежных раёнаў пры ўнясенні запісаў у метрыкі. Гэтыя дзеянні праводзілі прыходскія святары каталіцкіх прыходаў у Марцынкянцах і Ротніцы[31].

Не спынілася і нацыянальна-культурная праца. Напрыклад, 23 студзеня 1938 г. па ініцыятыве ксяндза Зянона Вуткевіча ў Марцынкянцах адбылося „аматарскае прадстаўленне”, прыбытак ад якога (226 зл. 90 гр.) быў перададзены на карысць таварыства „Рыцарства Ісуса”. На мерапрыемстве прысутнічала каля 700 чалавек, сярод якіх былі ўсе кіраўнікі былых чытальняў таварыства „Рытас” і былыя сябры Таварыства св. Казіміра з навакольных вёсак. Іх спецыяльна абвясцілі праз кур’ераў, якіх разаслаў Тэафіл Сухоцкі[32].

14 і 15 лютага 1938 г. у вёсцы Шумы (гміна Бершты Гродзенскага павета) аднавяскоўцы Юзаф Пілінко і Міхаіл Губачэўскі збіралі грошы на імшу, якая павінна была адбыцца ў вёсцы Рудня (гміна Араны Віленскага павета) 16 лютага з нагоды свята незалежнасці Літвы. Нацыянальнае свята ў вёсцы Кабелі (гміна Марцынкянцы Гродзенскага павета) было адзначана ўрачыстай імшой, якую правёў кс. Францішак Чадліс. У ёй прынялі ўдзел каля 60 асобаў моладзі, у тым ліку — кіраўнікі ліквідаваных чытальняў Таварыства „Рытас”. Усе ўдзельнікі мелі прышпіленыя банты нацыянальных літоўскіх колераў. Пасля набажэнства ўсе накіраваліся ў памяшканне літоўскага спажывецкага кааператыва „Galybe”, дзе прайшло ўрачыстае пасяджэнне[33].

У лютым 1937 г. з нагоды дня незалежнасці Літвы ў вёсцы Кабелі (гміна Марцынкянцы) было праведзена набажэнства, у якім прынялі ўдзел 200 чалавек. Яны прыбылі на фурманках, упрыгожаных сцяжкамі ў нацыянальных літоўскіх колерах. Пасля набажэнства частка сабраўшыхся (каля 80 чалавек) па запрашэнню Яна Навіцкага накіраваліся ў памяшканне кааператыва, дзе адбыўся ўрачысты сход. У Марцынкянцах у той жа дзень Ян Тамудэвіч спрабаваў сабраць былых сябраў

30 Tamże, k. 142v.
31 WAPwB, akta UWB, sygn. 98, k. 74.
32 WAPwB, akta UWB, sygn. 101, k. 13.
33 Tamże, k. 25v.

ліквідаванага аддзела Таварыства св. Казіміра. Аднак сход быў разагнаны паліцыяй, а 14 асобаў былі пакараны[34].

У красавіку 1938 г. пробашч з Марцынкянцаў ксёндз Зянон Буткевіч арганізаваў дзейнасць па пабудове шпіталя для літоўскага насельніцтва. На гэтыя мэты ён, па некаторых звестках, атрымаў дапамогу ад літоўцаў з Амерыкі[35].

У 1939 г. на тэрыторыі Гродзенскага павета „назіралася дзейнасць у справе заснавання аддзелаў Літоўскага каталіцкага дзеяння"[36].

Літоўскі нацыянальны рух на польска-літоўскім памежжы актыўна падтрымліваўся літоўскім бокам. Грошы, падпольная літаратура, агітацыйныя матэрыялы, дзякуючы кур'ерам, рэгулярна траплялі сюды з Коўна. Напрыклад, 16 лістапада 1936 г. у вёсцы Кабелі ў настаўніка пачатковай школы Казіміра Крывеля былыя настаўнікі літоўскіх школ і кіраўнікі рытасаўскіх чытальняў правялі нелегальны сход. Сярод прысутных былі: Тэафіл Сухоцкі, Казімір Крывель, Ян Навіцкі, Пётр Усяшкіс, Юзаф Відзінас, Вінцэнт Макарэвіч, Ян Мудэнас, Эльжбета Рымша, Уршуля Панавас, Антон Язукевіч. На сходзе вырашалася пытанне аб пошуках даверанай асобы, якая б выконвала паміж імі і літоўскімі ўладамі функцыі кур'ера. Выбар паў на Стэфана Яцкевіча, сына Дамініка і Дароты з Канстантынавічаў, народжанага 23 сакавіка 1908 г. у в. Паўлы (гміна Араны, сучаснае месцазнаходжанне не высветлена), які пражываў у Кабелях гміны Марцынкянцы. Запрошаны на сход Яцкевіч прыняў прапанову. Ужо праз некалькі дзён пасля гэтага ён быў накіраваны ў Літву. Мяжу пераходзіў у ваколіцах Аранаў. У гэтай справе яму дапамагла цётка, якая пражывала ў вёсцы. Пасля вяртання пасыльнага з ім сустрэліся Навіцкі і Крывель. Паліцыя не здолела даведацца пра мэту „камандзіравання", атрымала толькі інфармацыю пра тое, што Яцкевіч „быў прыхільна прыняты ў Літве і атрымаў грашовае ўзнагароджанне"[37].

Неабходна заўважыць, што польска-літоўская мяжа таго перыяду была дастаткова „празрыстай", а літоўскія памежнікі прыязна ставіліся да „гасцей" з другога боку. Напрыклад, 1 лютага 1937 г. настаўнік пачатковай школы ў Віцюнах (сучасн. — в. Віцюнай Друскенінкайскага р-на) Антоні Сянкевіч праз замёрзлую раку Нёман накіраваўся разам з 20 вучнямі ў вёску Лішкава (сучасн. — Лішкява Варэнскага р-на) у Літве. Там літоўскі пагранічнік адвёў іх у школу і касцёл. У той час, калі дзеці пад кіраўніцтвам мясцовага літоўскага настаўніка спявалі народныя песні і атрымалі ў падарунак кніжкі, выдадзеныя Саюзам вызвалення Вільні, Сянкевіч праводзіў размовы з раённым камендантам лі-

[34] WAPwB, akta UWB, sygn. 98, k. 24v.
[35] WAPwB, akta UWB, sygn. 101, k. 53.
[36] WAPwB, akta UWB, sygn. 107, k. 14v.
[37] WAPwB, akta UWB, sygn. 91, k. 129.

тоўскай пагранічнай стражы. Знаходжанне ў Літве працягвалася дзве гадзіны. За супрацьпраўны ўчынак польскія ўлады ўзялі з Сянкевіча падпіску аб нявыездзе[38].

Для забеспячэння рэгулярнага паступлення нелегальнай літаратуры, актывістамі літоўскага руху прадпрымаліся розныя захады. Напрыклад, у канцы 1936 г. Тэафіл Сухоцкі пачаў працу па стварэнні канспіратыўных гурткоў „Literatu Kuopa" („Літаратурная рота"). Заданнем сябраў гурткоў была дастаўка з Літвы „ковенскіх выданняў" і іх распаўсюджанне сярод літоўскага насельніцтва ў павеце. Паліцыя здолела вызначыць, што на пачатак 1937 г. такія арганізацыі былі створаны ў 8 вёсках[39].

Уяўленне аб тым, наколькі сур'ёзнай была падпольная дзейнасць літоўцаў, даюць звесткі аб выніках праводжаных польскай паліцыяй вобысках. 9 снежня 1936 г. быў праведзены вобыск у Уршулі Панасовіч, былой кіраўніцы чытальні Таварыства „Рытас" у Дубеніках (гміна Марцынкянцы), у выніку чаго была знойдзена пэўная колькасць літоўскіх кніг, выдадзеных у Коўне[40].

8 сакавіка 1937 г. у мэтах пошуку зброі быў дагледжаны дом Яна Гругаса (сына Юзафа і Валерыі, 1913 г. нараджэння) у вёсцы Кабелі (гміна Марцынкянцы). Зброі не знайшлі, але ў рукі паліцыі трапілі спісы сяброў канспіратыўнага літоўскага сельскагаспадарчага гуртка, спіс пазычаных для чытання кніг, пратакол сходу, 46 літоўскіх кніг, а таксама ліст да святара Чыбіраса[41].

Ва ўмовах канспірацыі кіраўнікі чытальняў выказаліся за тое, каб застацца ў сваіх месцах побыту і праводзіць працу ў эканамічнай сферы. Кіраўнік літоўскага руху ў Гродзенскім павеце Тэафіл Сухоцкі атрымаў з Вільні дырэктывы аб арганізацыі літоўскіх пажарных стражаў[42]. Былыя кіраўнікі ліквідаваных рытасаўскіх чытальняў і Таварыства св. Казіміра пачалі арганізоўваць у літоўскіх вёсках кааператывы, у рамках якіх спадзяваліся „найлепшым чынам сканцэнтраваць усю літоўскую працу і рэалізаваць акрэсленыя мэты"[43]. Узорам у гэтай справе служылі ўкраінскія кааператывы, якія існавалі ва ўсходняй Малапольшчы. З мэтай падрыхтоўкі працоўных кадраў для гаспадарак значная колькасць моладзі ў верасні 1936 г. была накіравана на спецыяльна арганізаваныя двухмесячныя кааператыўныя курсы ў Вільні. Іншай актыўнай дзейнасці літоўцы, баючыся рэпрэсій, не праяўлялі[44].

[38] WAPwB, akta UWB, sygn. 98, k. 24v-25.
[39] Tamże, k. 12.
[40] WAPwB, akta UWB, sygn. 91, k. 142v.
[41] WAPwB, akta UWB, sygn. 98, k. 38.
[42] WAPwB, akta UWB, sygn. 91, k. 59.
[43] Tamże, k. 127v.
[44] Tamże, k. 73, 83.

Філіял спажывецкага кааператыва „Galybe”, які існаваў у Кабелях (кіраўнік Ян Навіцкі) пачаў працу 30 лістапада 1936 г. у Капенішках (Мерацкая валасць Троцкага ўезда). Адкрыццё такіх філіялаў было закладзена ў статуце таварыства. У далейшым Навіцкі планаваў адкрыць філіялы ў Рандомянцах, Ротніцы і Нераве (сучасн. — Неравай Друскенінкайскага р-на)[45]. 18 сакавіка 1937 г. у в. Мустэйкі (гміна Марцынкянцы) быў адкрыты філіял згаданага кааператыва. Кіраўніком стаў Францішак Гайдзіс (сын Давіда і Агаты, 1906 г. нараджэння)[46]. З мэтай атрымання легальных падстаў для правядзення сходаў і большых магчымасцей кіравання моладдзю прадпрымаліся спробы арганізацыі суполак сельскагаспадарчай падрыхтоўкі па прыкладзе існуючых на той час у Сувалкаўскім павеце[47].

Кіраўнікі кааператыва ў Марцынкянцах і Кабелях Тэафіл Сухоцкі і Ян Навіцкі ў сваіх дамах збіралі моладзь з мэтай праслухоўвання радыёперадач з Коўна, а таксама ў памяшканнях кааператываў ладзілі сходы моладзі, на якіх чыталася „ковенская літаратура”. Настаўнікі пачатковых літоўскіх школ знаходзіліся ў сталым кантакце з Сухоцкім і ў сваёй дзейнасці кіраваліся яго дырэктывамі. Вынікам уздзеяння на моладзь кіраўнікоў „праковенскай акцыі” з’явіліся выпадкі распаўсюджання „ковенскіх часопісаў” і антыдзяржаўных лістовак. Толькі на працягу верасня 1936 г. было заўважна тры такія выпадкі. Каля вёскі Кабелі (гміна Марцінкянцы) у дзень, калі на Літве святкаваўся дзень салдата (8.09.) быў вывешаны транспарант у літоўскіх нацыянальных колерах, а таксама былі распаўсюджаны ўлёткі на літоўскай мове з наступным зместам: „Літвіны, нягледзячы на тое, што нашы аб’яднанні расфарміраваныя, не сядзіце склаўшы рукі!” У ноч з 27 на 28 верасня ў вёсцы Мустэйкі былі раскіданы літоўскія часопісы і ўлёткі. У наступную ноч ідэнтычныя ўлёткі з’явіліся ў вёсцы Кабелі. У далейшым абвінавачанне ў арганізацыі падобных акцый лягло на былых кіраўнікоў рытасаўскіх чытальняў, якія былі прадстаўлены як актыўныя сябры Саюза вызвалення Вільні і адначасова шпіёны[48].

У сувязі з вераснёўскім выпадкам распаўсюджання нелегальнай літаратуры, 5 кастрычніка быў праведзены вобыск у жыхара вёскі Даржэлі Філіпа Велентукевіча. У яго былі знойдзены 59 экземпляраў згаданых улётак, а таксама „шэраг іншых выданняў ковенскага паходжання”. Велентукевіч прызнаўся, што знойдзеныя выданні атрымаў ад сакратара распушчанага аддзела Літоўскага таварыства св. Казіміра ў Шклярах Сымона Вячкіса, які быў арыштаваны, але збег з-пад арышту.

[45] Tamże, k. 129.
[46] WAPwB, akta UWB, sygn. 98, k. 38.
[47] WAPwB, akta UWB, sygn. 91, k. 142.
[48] Tamże, k. 101v-102.

Згаданы Вячкіс займаўся сістэматычнай дастаўкай з Літвы нелегальнай літаратуры, якой забяспечваў кіраўнікоў рытасаўскіх чытальняў. Ён жа перадаваў на Літву „шпіёнскія матэрыялы, якія збіралі кіраўнікі чытальняў. Між іншым Вячкіс павінен быў перадаць атрыманыя ад Вінцэнта Макарэвіча, кіраўніка распушчанй рытасаўскай чытальні ў Шклярах, і Эльжбеты Рыенч, кіраўнічкі падобнай чытальні ў Кабелях (...) складзеныя апошнімі абрысы і планы з манеўраў польскага войска, якія праходзілі на тэрыторыі гмін Марцынкянцы і Бершты"[49].

З мэтай падтрымання кантактаў з шырокімі коламі літоўскай супольнасці ў студзені 1937 г. Т. Сухоцкі і Я. Навіцкі праз былых кіраўнікоў забароненых рытасаўскіх чытальняў прасілі ўсіх, хто выпісваў віленскія літоўскія часопісы, перадаваць ім неабходную суму на падпіску. Часопісы з пачатку года дасылаліся літоўскім спажывецкім каапературам у Марцынкянцах і Кабелях. У сувязі з гэтым падпісчыкі павінны былі асабіста звяртацца да Сухоцкага і Навіцкага за атрыманнем нумароў[50].

Адміністрацыйныя ўлады імкнуліся пазбавіцца ад пражываючых на іх тэрыторыі былых кіраўнікоў рытасаўскіх чытальняў. З гэтай мэтай восенню 1937 г. пачалася выкарыстоўвацца палітыка накладання адміністрацыйных спагнанняў на ўладальнікаў дамоў, у якіх пражывалі згаданыя актывісты. Літоўскі бок выдзеліў спецыяльныя сродкі для пацярпелых на пакрыццё штрафаў[51].

Неабходна канстатаваць значную залежнасць літоўскага нацыянальнага руху на памежжы ад фінансавання з Літвы. Яно здзяйснялася праз святара Чыбіраса ў Вільні. З апошнім кантактаваў кіраўнік літоўскага руху ў Гродзенскім павеце Тэафіл Сухоцкі, які перадаваў фінансавыя сродкі актывістам грамадскага руху. Напрыклад, 28 лістапада 1936 г. Сухоцкі вылікаў Антонія Езукевіча і Фелікса Моліша, былых кіраўнікоў Таварыства „Рытас". На сустрэчы ён паведаміў, што ў час апошняга свайго побыту ў Вільні атрымаў распараджэнне ад ксяндза Чыбіраса распачаць вясною будаўніцтва народнага дома ў Марцынкянцах, у якім бы размясціліся літоўскія арганізацыі, кааператыў і чытальня. На гэтай жа сустрэчы Езукевіч і Моліш атрымалі ад Сухоцкага па 140 злотых жалавання. За грашыма павінны былі яшчэ прыйсці Уршуля Панавас і Юзаф Відзіунас[52]. Гэта не адзіныя звесткі аб атрыманні актывістамі літоўскага руху грошай з Літвы. 30 жніўня 1937 г. Тэафіл Сухоцкі быў у Вільні, дзе атрымаў ад святара Чыбіраса жалаванне для

[49] Tamże, k. 113.
[50] WAPwB, akta UWB, sygn. 98, k. 12.
[51] Tamże, k. 143.
[52] WAPwB, akta UWB, sygn. 91, k. 129.

сябе (210 злотых), а таксама па 60 злотых для былых кіраўнікоў рытасаўскіх чытальняў Уршулі Панавас (в. Дубенікі), Юзафа Відзіунаса (в. Кашэты), Антонія Юркевіча (в. Капенішкі). Падчас сустрэчы Чыбірас параіў згаданым кіраўнікам змяніць месцы пражывання і на новых тэрыторыях праводзіць пралітоўскія мерапрыемствы, а таксама заняцца навучаннем дзяцей ў хаце[53].

Часам польскім уладам удавалася канфіскаваць грошы, што прыводзіла да значнага аслаблення актыўнасці літоўскага насельніцтва. Напрыклад, калі польскія ўлады канфіскавалі напачатку 1937 г. усе грошы, якія прызначаліся на выплату жалавання і дапамогі былым кіраўнікам рытасаўскіх чытальняў, было вырашана адмовіцца ад пабудовы вышэйзгаданага Літоўскага народнага дома ў Марцынкянцах. Сабраны на гэтыя мэты будаўнічы лес святар Чыбірас прадаў Сухоцкаму, які абавязаўся пабудаваць жылы дом на сваё імя з умовай таго, што пры пабудове будзе прадугледжана памяшканне для кааператыва і на правядзенне мерапрыемстваў. У сувязі з канфіскацыяй грошай Сухоцкі заклікаў у далейшым „сумленна выконваць усякія распараджэнні польскіх уладаў, бо ў іншым выпадку не будзе з чаго плаціць штрафаў"[54]. Вось так: ёсць грошы — ёсць рух, няма — поўнае падпарадкаванне закону. На наступны год усё ж такі былі прадпрыняты спробы атрымаць дазвол на будаўніцтва дома. Спачатку спрабаваў гэта зрабіць непасрэдна Сухоцкі, пазней да ўладаў звярталася падстаўная асоба. Усе намаганні былі марнымі, таму ў кастрычніку 1937 г. да ўладаў за дазволам на будаўніцтва царкоўнага дома ўжо меў намер звярнуцца святар Зянон Буткевіч[55].

Літоўскі народны дом акрамя Марцынкянцаў планавалася пабудаваць у Кабелях і Рандомянцах. У апошняй вёсцы на пабудову павінны былі ўжыць будаўнічы лес, закладзены на пабудову капліцы[56]. У Кабелях у падобным доме планавалася размясціць малочны кааператыў. Тут справай загадваў былы кіраўнік рытасаўскай чытальні з в. Шкляры Вінцэнт Макарэвіч. Ён жа разглядаўся як будучы кіраўнік кааператыва. Агітацыю па арганізацыі апошняга ён распачаў сярод жыхароў навакольных вёсак. Справа ішла наперад, бо Макарэвіч „быццам бы меў пэўную суму грошай на мэты пабудовы". Акрамя гэтага той жа Макарэвіч меў намер арганізаваць аддзелы Саюза вызвалення Вільні[57].

На стан літоўскага руху ў Польшчы ўплывалі і падзеі ўнутры Літвы. 28 лістапада 1937 г. у доме Сухоцкага адбыўся сход былых кіраўнікоў

[53] WAPwB, akta UWB, sygn. 98, k. 113.
[54] Tamże, k. 25.
[55] Tamże, k. 127v.
[56] WAPwB, akta UWB, sygn. 91, k. 33.
[57] WAPwB, akta UWB, sygn. 98, k. 37v.

рытасаўскіх чытальняў. На ім была выказана засцярога, што заклік Саюза студэнтаў у Коўне аб правядзенні жорсткіх рэпрэсій супраць палякаў, якія жывуць у Літве, можа выклікаць рэакцыю польскіх уладаў. У сувязі з гэтым ён раіў прытрымлівацца асцярожнасці ў сваіх учынках і пазбягаць правядзення сходаў у памяшканнях кааператываў, якія з'яўляюцца адзінымі легальнымі літоўскімі арганізацыямі ў Гродзенскім павеце[58].

Такім чынам, як сведчаць архіўныя дакументы, літоўскі нацыянальна-культурны рух на тэрыторыі Гродзенскага павета развіваўся пад непасрэдным кіраўніцтвам двух цэнтраў — у Вільні і Коўне. На яго вынікі значнае ўздзеянне аказвала фінансавая дапамога з Літвы. У перыяд 1930-х гадоў у дынаміцы руху на даследаванай тэрыторыі вызначаюцца два перыяды, падзелам якіх з'яўляецца вясна 1936 г., калі ўлады забаранілі дзейнасць найбольш масавых нацыянальных аб'яднанняў. Актыўным арганізатарам і кіраўніком апошніх у Гродзенскім павеце быў Тэафіл Сухоцкі. Значны ўдзел у актывізацыі нацыянальных пачуццяў літоўскага насельніцтва прымалі каталіцкія святары, былыя настаўнікі літоўскіх школ.

**Dzmitry Krywaszej** — kandydat nauk, pracownik Instytutu Historii Narodowej Akademii Nauk Białorusi.

[58] Tamże, k. 143.